**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Дварэцкая сярэдняя школа”**

## Класная гадзіна

## "Гендэрная роўнасць: за і супраць»

(10 клас)

Падрыхтавала:
класны кіраўнік 10 класа
Ігнацік М.І.

**21.11.2019**

## Класная гадзіна: "Гендэрная роўнасць: за і супраць»

**Мэта:** фарміраванне ўсвядомленых уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у сучасным грамадстве, у тым ліку ў сям’і, крытычнага стаўлення да гендэрных стэрэатыпаў і праявам дыскрымінацыі па палавой прыкмеце.
**Задачы:**
- навучыць вучняў бачыць гендэрныя праблемы ў грамадстве і ў сям'і, вызначыць сваё стаўленне да іх;
- разгледзець гендэрныя пытанні, якія датычацца стварэння роўных магчымасцяў для жанчын і мужчын з мэтай развіцця іх патэнцыялу і задавальнення сацыяльных патрэбаў;
- выхаванне ў вучняў культуры маўленчых зносін падчас спрэчкі; фарміраванне ўмення дыскуціраваць, проста і зразумела выкладаць свой пункт гледжання, пераканаўча яго даказваць, спакойна выслухоўваць довады апанента.

**Форма правядзення:** дыскусія
**Удзельнікі:** вучні 10-11 класа, класны кіраўнік 11 класа, педагог сацыяльны

**Ход правядзення:**

*Вядучая:* Сёння, 21 лістапада, адзначаецца Сусветны дзень прывітанняў. Яго галоўная мэта - звярнуць увагу шырокай грамадскасці на значнасць асабістых зносін для захавання міру. Паколькі толькі праз добрыя зносіны, а не ужыванне сілы, можна вырашыць практычна любыя канфлікты.

Я рада прывітаць вас усіх на сённяшняй сустрэчы. Спадзяюся, што яна дапаможа з аднаго боку, высвятліць шматлікія тэматычныя пытанні, а з другога боку, умацаваць нашыя добрыя асабістыя зносіны.

Нагадваю правілы правядзення дыскусіі.

Дыскусія - гэта спрэчка, слоўнае спаборніцтва, у якім кожны адстойвае сваё меркаванне. Важнай характарыстыкай дыскусіі, якая адрознівае яе ад іншых відаў спрэчкі, з'яўляецца аргументаванасць. Абмяркоўваючы спрэчную (дыскусійную) праблему, кожны бок, апаніруючы думку суразмоўцы, аргументуе сваю пазіцыю. Пры гэтым неабходна памятаць, што дыскусія - форма дэмакратычных зносін, таму падчас спрэчкі патрабуецца прытрымлівацца культуры маўленчых зносін, г.зн. не толькі дыскуціраваць, проста і зразумела выкладаць свой пункт гледжання, пераканаўча яго даказваць, але і спакойна выслухоўваць довады апанента.

*Вучні працуюць у дзвюх групах: юнакі і дзяўчаты.*
*Класны кіраўнік 11 класа і педагог сацыяльны выступаюць у ролі незалежных экспертаў.*
*Вядучая аб'яўляе тэму дыскусіі.*
*Вучні абмяркоўваюць тэму, аналізуюць яе значнасць і актуальнасць для сучаснага грамадства, фармулююць задачы дыскусіі.*

*Вядучая:* Давайце падвядзём пачатковыя вынікі. Так што такое гендэрная роўнасць?

*Гендэрная роўнасць* мае на ўвазе грамадства, у якім і жанчыны, і мужчыны валодаюць роўнымі магчымасцямі, правамі і абавязкамі ва ўсіх сферах жыцця: адукацыі і ахове здароўя, кіраванні і ўладзе, маюць роўныя магчымасці дасягнуць фінансавай незалежнасці, працуючы на каго-небудзь ці кіруючы ўласным бізнэсам, рэалізацыі сваіх асобасных і прафесійных патрэб і інтарэсаў.

*Вядучая:* Але перш, чым перайсці да грамадства ў цэлым, давайце пачнём з абмеркавання гендэрных пытанняў у сям'і, таму што кожны з нас перш за ўсё жыве ў сям'і. Сям'я – гэта міжасабовыя зносіны, праяўленне псіхалогіі людзей. Ці будзе шчаслівая сям'я, залежыць безумоўна ад тых, хто яе стварае. Гавораць, ствараючы сям'ю, неабходна ў два разы паменшыць свае правы і ў два разы павялічыць свае абавязкі. А галоўнае, зразумець сапраўднае прызначэнне мужчыны і жанчыны ў сям'і…

**Пытанні для абмеркавання:**

- Хто павінен быць галоўным у сям'і?
- Хто павінен выхоўваць дзяцей?
- Ці згодныя вы, каб мужчына займаўся хатняй гаспадаркай?
- Ці павінна жанчына працаваць? Ці можа яна адбыцца ў прафесійным плане?
- Хто павінен утрымліваць сям'ю ў грашовым плане?
- Ці мае права жанчына на імкненне пабудаваць кар'еру і атрымаць дастойны заробак?
- Ці згодныя вы, каб мужчына быў на бальнічным у сувязі з хваробай дзіцяці?
- Што важней для сучасных мужчын і жанчын: сям'я або кар'ера?

**Заданні для груп:**

✓ *На якім месцы па ступені значнасці для вас знаходзяцца сацыяльныя ролі, якія выконваюць мужчыны і жанчыны (ад самой значнай да найменш значнай). Абгрунтуйце свой пункт гледжання.*

| Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|
| Мужык<br>Бацька<br>Сын<br>Сем'янін<br>Кіраўнік<br>Падначалены<br>Брат<br>Сябар<br>Свой варыянт | Жонка<br>Маці<br>Дачка<br>Хатняя гаспадыня<br>Кіраўнік<br>Падначалены<br>Сястра<br>Сяброўка<br>Свой варыянт |

✓ *Размяркуйце па слупках «мужчына» і «жанчына» наступныя якасці:*

Мужнасць
Смеласць
Мэтанакіраванасць
Рашучасць
Уменнне спачуваць

Жаночасць
Пяшчота
Рамантычнасць
Актыўнасць
Настойлівасць

*Дабайце свае варыянты*

- Ці могуць некаторыя якасці з слупка “мужчына” быць у слупку “жанчына”?
- Ці магчыма сказаць, што калі ў слупку “мужчына” ёсць якасці з слупка “жанчына”, то гэта дрэнна?
- Ці павінны быць роўнымі мужчына і жанчына ў сям’і? На рабоце? У інтэлектуальным і культурным плане? У бізнэсе? У палітыцы?
- Як вы ставіцеся да факту кіравання жанчынамі аўтамабіля? Селі б вы да жанчыны ў таксі? Даверылі б вы сваіх дзяцей у аўтамабіль да жонкі?
- Ці сустракаліся вы ці вашы сваякі з дыскрымінацыйнымі патрабаваннямі (па прыкмеце полу) пры прыёме на працу?
- Хто і з якімі якасцямі хутчэй адапціруецца ў жыцці?
- Якія якасці неабходна выхоўваць у сабе сучаснай дзяўчыне? Юнаку?
- Якой бы вы хацелі бачыць “сваю другую палавінку”?
- Калі сям’я будзе шчаслівай?
- Ці ёсць якасці, якіх вам пажадана пазбаўляцца?
- Што неабходна вам для асабістага шчасця?

*Каманды робяць высновы, незалежныя эксперты аналізуюць выказаныя ідэі і аргументы. Затым вядучая падводзіць вынікі дыскусіі.*

*Вядучая:* Так, гендэрная роўнасць не азначае, што абодва пола аднолькавыя, а хутчэй, што яны роўныя ў правах і годнасці.

На будучае хацелася, каб у дзяўчынак прысутнічала вялікая ўпэўненасць у сабе, настойлівасць, незалежнасць і ўдзел у грамадскай дзейнасці, пры гэтым, каб яны не забывалі аб сацыяльнай каштоўнасці традыцыйных жаночых заняткаў, такіх як мацярынства, і якасцяў, такіх як клопат, увага, супрацоўніцтва і памяркоўнасць.

У сваю чаргу хлопчыкам жадаю магчымасці пераадолення страху няўдачы, умення спраўляцца з агрэсіяй, павышэння ступені сацыялізацыі і адказнасці, пры гэтым, каб і яны не забывалі аб сацыяльнай каштоўнасці традыцыйных мужчынскіх заняткаў, такіх як абарона сям’і, Радзімы, і якасцяў, такіх як мужнасць, смеласць, настойлівасць.

Галоўнае, мы ўсе павінны разумець, што розны ўклад мужчын і жанчын у сям'ю і грамадства роўным чынам важныя, паколькі і мужчыны, і жанчыны маюць роўныя правы і нясуць роўную адказнасць. І вельмі значна, калі людзі ўмеюць дамаўляцца і знаходзіць кампрамісы.

Спадзяюся, што і ў нас гэта сёння атрымалася. Дзякую вам.